Т. В. Бурко, С. М. Ганчар *(г. Вілейка)*

# З ГІСТОРЫІ МАЛОЙ РАДЗІМЫ І. К. КАНДРАЦЬЕВА

Кожны чалавек павінен ганарыцца сваёй радзімай, ведаць і шанаваць свой род. Гэткім разам наша зацікаўленне – прыгожая вёска Каловічы, што на Вілейшчыне: як і калі яна ўзнікла, якія гістарычныя падзеі адыгралі значную ролю ў фарміраванні яе жыццёвага ўкладу, памяць якіх выбітных землякоў берагуць яе жыхары і з гордасцю перадаюць новым пакаленням.

Летапіс вёскі Каловічы пачынаецца ў 1590 г. і мае доўгі і складаны шлях у больш як 420 год. Аднак яго вытокі абазначаны 1579 г., калі першай уладальніцай каловіцкіх земляў стала Анастасія Мсціслаўская, якая ў 1590 г. пачала засяляць там сваіх рэкрутаў. Сярод першародаў Каловіч вылучаюць сям’ю Гулецкіх, менавіта гэта прозвішча з’яўляецца найбольш распаўсюджаным у вёсцы і ў цяперашні час. Таксама сярод першапасяленцаў такія прозвішчы, як Капцюг, Новаш, Кляшняк, Валынец, Кумпяк, Сушко, Субач, Смолік і інш.

Сама назва Каловічы, магчыма, паходзіць ад слова «кол» – глыбокай, яшчэ дахрысціянскай старажытнасці. У даўнія часы надзелы зямлі пазначалі «палкамі», ніжнія канцы якіх былі завостраны, – «каламі». Існуе паданне, што нячыстыя на руку мясцовыя зямельныя ўласнікі перастаўлялі гэтыя калы, чым і займелі ганебную славу, а таму і пачала называцца тая мясцовасць «Каловічамі».

З 1599 па 1765 г. уласнікамі каловіцкіх зямель быў род Пацаў. У гісторыі вёскі таксама былі перыяды, калі яна, пачынаючы з 1631 г. уваходзіла ў Маркаўскую дзяржаву Ашмянскага павета Вялікага Княства Літоўскага, з 1765 г. – у Вілейскае староства, а пасля другога падзелу Рэчы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паспалітай (1793) апынулася ў Расійскай імперыі. У 1800 г. вёска Каловічы ўвайшла ў Вілейскі павет Мінскай губерні і стала пажыццёвай уласнасцю Іосіфа Куранецкага. На той час у вёсцы налічвалася 27 двароў і 168 жыхароў. У 1866 г. у Каловічах было адчынена народнае вучылішча, якое месцілася ў грамадскім доме. На ўтрыманне вучылішча адпускалася 209 рублёў у год са збору з дзяржаўных сялян. У 1890 г. у Каловіцкім народным вучылішчы навучаліся 53 хлопчыкі
і 4 дзяўчынкі, у 1896 г. – 87 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі, у 1905 г. налічвалася 114 навучэнцаў – 105 хлопчыкаў
і 9 дзяўчынак.

У 1873 г. вёска Каловічы ўвайшла ў склад дзяржаўнага маёнтка Вілейка Вілейскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, дзе налічвалася 120 рэвізскіх душ. З 1897 г. Каловічы сталі цэнтрам воласці Вілейскага павета, вёска налічвала 69 двароў і 557 жыхароў, тут дзейнічалі народнае вучылішча, 2 хлебазапасныя магазіны, піцейны дом, існавала капліца. На 1908 г. вёска мела 81 двор і 509 жыхароў, якія валодалі 409 дзесяцінамі надзелаў.

З 1921 па 1939 г. Каловічы знаходзіліся ў складзе Польшчы, у 1938 г. сталі цэнтрам гміны Вілейскага павета Віленскага ваяводства. На гэты час вёска налічвала 90 двароў з 522 жыхарамі, тут працавала польска-беларуская пачатковая школа. А ў саму Каловіцкую гміну ўваходзіла 86 вёсак.

З лістапада 1939 г. Каловічы ўвайшлі ў склад БССР, і з 15 студзеня 1940 г. былі ўключаны ў Куранецкі раён Вілейскай вобласці, дзе з 12 кастрычніка таго ж года вёска стала цэнтрам Каловіцкага сельскага Савета, у які ўваходзіла 26 населеных пунктаў з колькасцю жыхароў – 3522.

У Вялікую Айчынную вайну з 25 чэрвеня 1941 г. да 3 ліпеня 1944 г. вёска Каловічы была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З вайны не вярнуліся 22 вяскоўцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод удзельнікаў вайны Фёдар Гулецкі, Міхаіл Новаш, Мікалай Дубовік, Іван Субач, Іван Дурэйка, Станіслаў Гулецкі, Мікалай Новаш і інш. Усю вайну ад самага пачатку і да канца прайшоў Уладзімір Новаш, партызанамі былі Яўген Бурко, Пётр Дашко, Пётр Гулецкі, Міхаіл і Барыс Смолікі, Антон Капцюг.

Пасля вызвалення Вілейшчыны Каловічы спачатку ўвайшлі ў склад Куранецкага раёна Вілейскай вобласці (з 20.09.1944), потым у склад Вілейскага раёна Маладзечанскай вобласці (з 03.06.1946), а з 20 студзеня 1960 г. у склад Мінскай вобласці. У 1948 г. быў створаны калгас «Шлях Ільіча», першым старшынёй быў Рогач Мікалай Кандрацьевіч. На 1960-я гг. у вёсцы налічвалася 432 жыхары, а Каловіцкі сельскі Савет складаўся з 15 населеных пунктаў, дзе пражывала 3510 чалавек.

У 1971 г. Каловічы мелі 395 жыхароў, 147 двароў, пачатковую школу, клуб, аддзяленне сувязі і магазін. 28 ліпеня 1980 г. Каловіцкі сельскі Савет перайменаваны ў Любанскі, і адпаведна цэнтр быў перанесены ў в. Любань.

На 2008 г. Каловічы налічвалі 93 гаспадаркі і 197 жыхароў, тут мелася бібліятэка, Дом майстроў, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

З гэтай вёскі паходзяць паэты і драматургі, кампазітары, навукоўцы, хірургі, іканапісцы, інжынеры і журналісты. Дастаткова толькі нагадаць, што вёска Каловічы радзіма паэта, празаіка, драматурга, перакладчыка Івана Кузьміча Кандрацьева, які нарадзіўся тут 9 (21) чэрвеня 1849 г. у сялянскай сям'і. У Каловічах прайшлі дзяцінства і юнацтва беларускага культуролага, гісторыка, прафесара, доктара культуралогіі А.І. Смоліка, аўтара манаграфіі і шэрагу артыкулаў пра жыццё і творчасць І. Кандрацьева. Такім чынам, Каловічы сталі малой радзімай многіх сумленных, таленавітых, горача адданых свайму краю асоб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Архіўныя* матэрыялы ДУ «Вілейскі краязнаўчы музей».
2. *Гарады* і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал. : Т.У. Бялова [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2010. – Т. 8 : Мінская вобласць. Кн.1 – 736 с.
3. *Памяць :* гісторыка-дакументальная хроніка Вілейскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 704 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ